ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

27 ЖНІЎНЯ 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 16 (15775)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## «ІНЖЫР»:

# «Бярыце ініцыятыву ў свае рукі»



**Трыа, дзе працуюць Марыя Разумава, Таццяна Камарова і Марыя Яковіч — калектыў вядомы па такіх праектах, як украінскае шоу «Х-фактар», Emporio Music Fest by Baigali in Moscow. І гэты спіс можна працягваць. Цяпер дзяўчаты заняты падрыхтоўкай да «Новай хвалі» — конкурс сёлета пройдзе ў Сочы ўвосень. Аднак яны знайшлі магчымасць сустрэцца і пагаварыць пра беларускую эстраду, працоўны энтузіязм і магчымасці для прафесійнага росту.**

***— Сёлета вы прадстаўляеце Беларусь на конкурсе «Новая хваля». Ці складана было прабіцца?***

**Таццяна Камарова:** «У паўфінале ад Беларусі было сем прадстаўнікоў. Адбор праходзіў у Маскве, бо ў нас ён ужо гады два як не праводзіцца».

**Марыя Разумава:** «Канкурыравалі мы не канкрэтна з удзельнікамі ад нашай краіны, а з усімі, хто прайшоў папярэднія кастынгі і трапіў у паўфінал. Была задача — здабыць сабе месца сярод паўфіналістаў. Там усё адбываецца па прынцыпе: калі ўдзельнік падабаецца журы, то ён праходзіць далей. Таму прэтэндэнты змагаюцца за тое, каб краіна прагучала на конкурсе».

***— А вы адсочваеце, што адбываецца цяпер на розных музычных конкурсах і фестывалях?***

**Марыя Разумава:** «Нядаўна прайшоў «Славянскі базар у Віцебску», за якім я назіраю штогод...»

**Таццяна Камарова:** «Пра канкурсантаў, якія прадстаўляюць там Беларусь, не магу сказаць, што яны слабыя. Нашы ўдзельнікі вельмі годна абараняюць гонар краіны. У тым ліку і Валерыя Грыбусава. А вось сам фестываль стаў іншым. Я з дзяцінства ездзіла туды з бацькамі. Мы куплялі білеты на конкурс маладых выканаўцаў і назіралі з цікавасцю за ўсім, што там адбываецца. Цяпер жа пасля прагляду выступленняў канкурсантаў ужо не застаецца здзіўлення. А гэты момант, мне здаецца, мае значэнне для гледача».

**Марыя Яковіч:** «Выканаўцы развіваюцца больш імкліва, чым сам фестываль. Нашы артысты імкнуцца выехаць за мяжу, каб мець магчымасць расці прафесійна. Ёсць беларуская эстрада, на якой заняты пэўныя нішы. А дзе дэманстраваць і шукаць сябе іншым, у тым ліку і маладым выканаўцам — пытанне адкрытае... Просты прыклад: трыа «Інжыр» — калектыў, пра які даведаліся толькі пасля нашага ўдзелу ў шоу «Х-фактар». Хоць да таго мы ўжо існавалі год!

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

Добрае пачынанне

# СТУДАТРАД... У БЕЛЫХ ХАЛАТАХ

**З пачатку ліпеня ў клініках і бальніцах Мінска пачалі працаваць медыцынскія студэнцкія атрады. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» наведалі 5-ю гарадскую клінічную бальніцу і даведаліся, як на практыцы выкарыстоўваюць свае веды студэнты-медыкі.**

## ЗАПОМНІЦЬ НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

— Толькі накіньце, калі ласка, халат, — папярэджвае мяне адразу, як толькі мы падняліся на трэці паверх, Даша Рындава. — У нас тут з гэтым строга. Самі разумееце, аддзяленне рэанімацыі.



Юрый Лагун.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Даша вучыцца на шостым курсе Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта і расказвае, што ўсе студатрадаўцы стараюцца выконваць нават самыя простыя «законы і правілы» бальніцы, у якой працуюць. «Адзін раз запомніш, як трэба, і на ўсё жыццё адкладзецца». А ў іх прафесіі, як кажа дзяўчына, рабіць няправільна забараняецца.

Усяго гэтым летам у сталічных медыцынскіх студатрадах задзейнічана 206 студэнтаў. Для тых, хто ўжо паспеў скончыць трэці курс, у клініках даступныя вакансіі медсясцёр і медбратоў, а для астатніх — медыцынскіх рэгістратараў і санітараў.

Дарэчы, сёлета медыцынскія студатрады працуюць у тэставым рэжыме і ўступіць у іх змогуць толькі студэнты сталічнага медуніверсітэта. Але калі гэты пілотны праект зарэкамендуе сябе, то не выключана, што ўжо наступным летам атрымліваць бонусы ад працы ў студатрадах змогуць таксама студэнты ўсіх беларускіх медыцынскіх ВНУ і каледжаў. А іх абяцаюць нямала. Напрыклад, засяленне ў інтэрнат і значная зніжка (да 60%) на аплату навучання. Найбольш жа актыўных студэнтаў будзе прэміраваць і сам універсітэт.

— Я працую медыцынскай сястрой і выконваю ўсе лячэбныя, гігіенічныя і іншыя ўрачэбныя прызначэнні. Медсястра раздае лекі, ставіць кампрэсы, гарчычнікі, клізмы, бярэ ў хворых матэрыял для лабараторных даследаванняў, сочыць за выкананнем прызначанага хвораму рэжыму, прыёмам лекаў. Падчас свайго дзяжурства сястра павінна сачыць за станам і самаадчуваннем хворых (вымяраць тэмпературу, адсочваць дынаміку пульсу і дыхання), — тлумачыць студэнтка.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***

Агні вялікага горада

# ЯК ПРЫЕЗДЖЫЯ «ЗАВАЁЎВАЮЦЬ» СТАЛІЦУ

## Ці яна іх?

**Мінск — сінонім поспеху для многіх абітурыентаў з правінцыі. Некаторыя лічаць, што калі атрымалася стаць студэнтам сталічнай навучальнай установы, то пабудаваць кар'еру ў гэтым горадзе будзе нескладана. І сапраўды, не ўсе з такіх шчаслівучыкаў вяртаюцца дадому....**

**Віталь ЦІВУНЧЫК, прыехаў з Бераставіцы, жыве ў сталіцы 8 гадоў:**

— Мая адаптацыя праходзіла ў асноўным у рамках універсітэта. Зразумела, прызвычаіцца да вялікай колькасці людзей і шуму вялікага горада было складана... Але дапамагалі мінчане: падказвалі, на якім аўтобусе трэба ехаць, куды лепш пайсці па пакупкі.

Сам сябе не адчуваю мінчанінам на 100 працэнтаў і наўрад ці калі-небудзь адчую. Мінск — горад для працы, і ў той жа час тут шмат прыгожых месцаў, дзе можна цікава правесці час. Але раз на месяц мне абавязкова трэба з'ехаць з гэтых «каменных джунгляў» у родную Бераставіцу ці яшчэ куды. Як бы пафасна гэта не прагучала, але душой я адпачываю толькі дома, там, дзе мае бацькі, дзе я рабіў першыя крокі па жыцці.

***(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)***



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.